Болбас, В. С. Этнапедагагічныя ідэі баларусаў і сучаснасць / В. С. Болбас // Канцэптуальныя асновы агульнаадукацыйнай школы з 12-ці гадовым тэрмінам навучання : Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя. – Мінск : НІА, 1995. – С. 25–26.

# ЭТНАПЕДАГАГІЧНЫЯ ІДЭІ БЕЛАРУСАЎ І СУЧАСНАСЦЬ

Адна з прычын выхаваўчых няўдач сучаснай школы бачыцца ў тым, што, як і ў папярэднія часы, яе работа будуецца на нейкім універсальным, практычна аднолькавым для любых народаў і нацый, навукова-педагагічным падмурку. Гістарычны ж народна-выхаваўчы вопыт паказвае, што не толькі кожнай краіне патрэбна свая ўласная, адметная ад іншых дзяржаў школа, а і школы любых этнічных супольнасцей, асобных рэгіёнаў і нават розных мясцовасцей павінны мець свае апірышчы на асаблівасці культуры свайго этнасу, на характэрныя адрозненні навакольнага асяроддзя як прыроднага, так і сацыяльнага.

Кожная нацыя ў рэшце рэшт мае сваю імпліцытную педагагічную канцэпцыю, якая адлюстроўвае вітальныя і ментальныя асаблівасці этнасаў у выхаванні дзяцей. Задача педагагічнай навукі заключаецца ў тым, каб найбольш поўна і дакладна вывучыць народна-выхаваўчыя ідэі і зрабіць іх дзейснымі крыніцамі сілкавання сучасных тэарэтычных распрацовак. Менавіта такія адносіны да педагагічнай спадчыны Бацькаўшчыны дадуць непараўнальна больш, чым фрагментарнае, вузка-прагматычнае выкарыстанне асобных яе напрацовак, што, на жаль, і робіцца ў апошні час. Наогул, галоўным напрамкам выкарыстання вопыту нашых продкаў павінна быць не экстрапаляцыя тагачасных рэалій у сучаснасць, а развіццё на яго аснове новых падыходаў, якія дапамогуць вырашаць многія сённяшнія праблемы.

Практыка вывучэння гэтага пытання дае магчымасць адзначыць некаторыя характэрныя ідэі этнапедагогікі Беларусі, выкарыстанне якіх дазволіць стварыць сучасныя педагагічныя канцэпцыі, з'арыентаваныя на перспектывы будучыні.

1. Галоўнай мэтай беларускай народнай педагогікі заўсёды было выхаванне высокай духоўнасці, маральнай дасканаласці.

2. Адукаванасць разглядалася як неабходная, базавая ўмова для фарміравання дабрачыннай, цнатлівай асобы.

3. Працоўнае, фізічнае, эстэтычнае выхаванне ў многім падпарадкоўвалася задачам маральнага ўдасканалення асобы.

4. У беларусаў, як і ў іншых усходніх славян, клопат аб выхаванні падрастаючых пакаленняў лічыўся найпярвейшым клопатам сям'і і грамадства. Нават павага да старасці адцяснялася ім на другі план.

5. Шматканфесійнасць, полікультурнасць, сур'ёзны замежны ўплыў накладвалі свой адбітак на многія бакі сацыяльнага жыцця, але ў вызначэнні выхаваўчых прыярытэтаў назіралася зайздроснае пастаянства.

6. Змястоўны бок выхаваўчага працэсу спалучаў у сабе напрацоўкі ўласнага вопыту і педагагічныя набыткі іншых народаў, якія ўдала сінтэзаваліся з асноўнымі пастулатамі хрысціянскай этыкі.

7. Гуманістычная скіраванасць і дэмакратычная афарбоўка характарыстычна вызначалі народна-выхаваўчыя ідэі беларусаў.

8. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі выхавання ў айчыннай педагагічнай думцы мелі на мэце фарміраванне інтравертнага характару паводзін чалавека.

9. Адной з умоў выніковасці народнай педагогікі было тое, што выхаванне не аддзялялася ад жыцця, не замыкалася ў штучны працэс, а ўсё навакольнае асяроддзе становілася "выхаваўчай школай".